Чытальня

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ТРАДЫЦЫЙ

**Нядаўна свет пабачыла шмат цікавых кніг, якія будуць карысныя тым, хто цікавіцца традыцыйнай беларускай культурай і гісторыяй. Сакрэты ўнікальнага віду рамяства, вынікі карпатлівых даследаванняў, найлепшыя рэцэпты беларускай кухні і многае іншае. Прапануем чытачам «Звязды» азнаёміцца толькі з некаторымі навінкамі.**




**Вольга Лабачэўская. Мастацтва дзеля славы Божай: саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы, выдавецтва «Беларуская навука».**

Выданне прадстаўляе шэдэўры беларускага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва — саламяныя царскія вароты пачатку XIX стагоддзя з іканастасаў палескіх цэркваў. Некаторыя архіўныя крыніцы ўпершыню ўведзены ў навуковы абарот, дзякуючы ім разглядаецца гісторыя вывучэння, музеефікацыі і рэстаўрацыі ўнікальных саламяных твораў сакральнага прызначэння, мастацкая стылістыка і тэхніка іх пляцення. Аўтар аналізуе глыбокія народныя вытокі гэтага віду мастацтва.

У альбоме паказаны сучасны працяг унікальнай традыцыі — выраб копій стaрадаўніх саламяных іканастасных варотаў і шлюбных вянцоў, арыгінальных твораў для царкваў — іканастасаў, кватаў ікон, вянчальных карон і мітраў для святароў.

Кніга ўзбагачае веды аб гісторыі беларускага саламянага мастацтва і прызначана яго знаўцам і аматарам.




**Гербоўнік беларускай шляхты. Том 5: Д, выдавецтва «Беларусь».**

Кніга — працяг шматтомнага выдання, распачатага ў 2002 годзе. У пятым томе «Гербоўніка беларускай шляхты» пададзена 213 радаводаў шляхты пераважна Мінскай губерні на літару «Д», складзеных на падставе матэрыялаў фонду Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу.

У выданні можна знайсці звесткі аб роднасных сувязях прадстаўнікоў таго ці іншага роду, дату нараджэння і смерці, месцы пражывання, валоданне нерухомай маёмасцю, займанне пасад на дзяржаўнай (грамадзянскай або ваеннай) і прыватнай службе, удзеле ў гістарычных падзеях. Усяго том змяшчае звесткі пра тысячу шляхціцаў, якія жылі ў Беларусі да пачатку XX стагоддзя.

Для зручнасці выкарыстання зборнік забяспечаны іменным і геаграфічным паказальнікамі, пададзены аб'ёмны агляд айчынных публікацый па гісторыі шляхецкага саслоўя.

Зборнік — вынік некалькіх гадоў працы супрацоўнікаў архіва Яўгена Глінскага (кіраўніка аўтарскага калектыву), Дзмітрыя Мацвейчыка, Юрыя Снапкоўскага і Вадзіма Урублеўскага.




**Алесь Белы. «Беларуская кухня. Гастранамічны даведнік», выдавецтва «Рэнесанс Паблішынг».**

Выданне прысвечана багатай гістарычнай спадчыне беларускай кухні, у ім сабрана больш за 40 страў і 8 напояў, іх рэцэпты і гісторыі ўзнікнення.

Кніга мае не толькі адукацыйнае, але і прыкладное значэнне. Апроч гісторый і рэцэптаў тут сабраныя рэстараны, аграсядзібы і прыватныя майстры, якія адраджаюць беларускія традыцыі сыраробства, хлебапячэння, піваварства і пераасэнсоўваюць нацыянальныя стравы.

Першая частка гастранамічнага даведніка прысвечана аўтэнтычным і важным у беларускай спадчыне стравам. Другая частка пазнаёміць з беларускімі напоямі, безалкагольнымі і алкагольнымі. Старка, зуброўка, разнастайныя настойкі, бярозавік і нават кава — якімі яны былі ў мінулым і што сталася цяпер.

Выданне імкнецца да таго, каб развеяць стэрэатыпы пра выключна вясковае мінулае беларускай кухні і яе аднастайнасць і паказаць жыццяздольнасць «старых» рэцэптаў у свеце сучаснай гастраноміі.

**Варвара ГОМАН.**

# ПАБЫВАЦЬ НА «НЯБЁСАХ»

**На стары Новы год раздалі ўзнагароды лаўрэатам Міжнароднага каляднага фестывалю батлеечных і лялечных тэатраў «Нябёсы», што ладзіцца ў Свята-Елісавецінскім манастыры ўжо пяць гадоў запар.**

Сёлета, расказаў мастацкі кіраўнік фэсту, акцёр тэатра і кіно Аляксандр Ждановіч, у конкурснай праграме ўдзельнічалі 15 тэатральных калектываў з пяці краін свету, а прадстаўленні іх убачыла і наведала тры дзясяткі творчых майстар-класаў больш як 1600 чалавек. Акрамя таго, фінішавала традыцыйная дабрачынная акцыя «Свята душы — дабрадзейнасць», якая пачалася яшчэ ў кастрычніку 2018 года. Падчас яе беларускія і замежныя калектывы паказвалі свае спектаклі ў розных установах — бальніцах, дамах-інтэрнатах, сацыяльных прытулках і г. д. Сёлета часцінку душэўнага цяпла і каляднай атмасферы тым чынам падарылі гледачам 20 дабрачынных пастановак. Зрэшты, тут рана ставіць кропку: яшчэ ёсць некалькі адрасоў, дзе артыстаў вельмі чакаюць, і ёсць ахвотныя прывезці радасць людзям, якія засталіся без апекі блізкіх ці апынуліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі.

Адным са спецыяльных гасцей сёлетняга фестывалю стаў айцец Васіль — святар з Палесся, які якраз у гэтыя дні адзначаў 90-ы дзень нараджэння. Нягледзячы на вельмі шаноўны ўзрост, ён працягвае весці службы і захоўвае варты пераймання жыццёвы аптымізм — што юбіляр і пацвердзіў, пажадаўшы прысутным «цікамір'я, спакою на ўсім зямным шары і жыць па 150 гадоў», а таксама выканаўшы неканaнічную, але вельмі прыгожую палескую духоўную песню.



Адразу некалькі ўзнагарод юбілейнага фестывалю, у тым ліку асобную падзяку арганізатараў за захаванне народнага духу і культурных традыцый батлейкі, атрымаў сямейны тэатр Аляксандра і Ларысы Быцко, якія заснавалі аграсядзібу і культурны цэнтр у пакінутай людзьмі вёсцы Стойлы на Пружаншчыне. «Пасля 50 гадоў мы пачалі з мужам зноў гуляць у лялькі, — смяецца Ларыса, — стварылі сваю сямейную батлейку і пераканаліся, што гэта патрэбна не толькі нам! Нашаму тэатру ўсяго два гады, а мы пабывалі ўжо на некалькіх міжнародных фестывалях, у тым ліку двойчы — на «Нябёсах», дзе адкрываюцца душы і сэрцы...» Таксама некалькімі дыпломамі быў адзначаны дзіцячы драматычны гурток «Жаронцы» з Ракаўскага цэнтра народнай творчасці, які паказаў народную драму «Цар Ірад» на беларускай мове. Шэраг уласных прызоў уручылі партнёры фестывалю — прадстаўнікі Рассупрацоўніцтва (расійскага цэнтра навукі і культуры ў Мінску). Найлепшым дэбютам назвалі «Шарсцяную казку» тэатра «Ліхтарык» з Таліна. «Я, натуральна, не прарок, але чамусьці ўпэўнены, што ваш фестываль — такое асаблівае месца, дзе раскрываецца ўсё самае лепшае і светлае ў чалавечых душах, — хутка пашырыцца і выйдзе на вялікія сцэны», — падзяліўся меркаваннем кіраўнік эстонскага тэатра Роберт Вааб.

Спецыяльны дыплом памяці заснавальніцы фэсту Людмілы Ждановіч «За самы вясёлы і гарэзлівы спектакль» атрымалі масквічы з тэатра «У чамадане», а Гран-пры за найлепшы спектакль журы прысудзіла тэатру «Душагрэі» *(на фота)*, які ўваходзіць у міжнародную асацыяцыю «Вандроўныя лялечнікі» (Масква) за спектакль «Вінаградная ягадка».

Пра асаблівую атмасферу фэсту гаварылі таксама замежныя госці. «Мы не артысты, а звычайныя настаўнікі, якія працуюць у школе. Але тут адчулі сябе «сваімі», часткай адной вялікай творчай сям'і, — расказалі ўдзельнікі камернага тэатра «Пілігрым» з Каломны. — І гэта проста выдатна, што існуе такая пляцоўка, дзе на роўных могуць сустрэцца, выступіць, абмеркаваць важныя пытанні і прафесійныя тэатры, і самадзейныя калектывы, і сямейныя гуртки — людзі розных узростаў, адукацыі, сацыяльнага статусу, якіх аб'ядноўвае любоў да мастацтва і дэвіз фэсту «З лялькай да Бога». А «чалавек-аркестр» Альфонсас Рамейка, які зрабіў моцнае ўражанне сваім монаспектаклем «Падарожжа да караля адказаў Таму», эмацыянальна прызнаўся наўпрост са сцэны: «Я такі шчаслівы, што прыехаў на свой першы фестываль і знайшоў столькі новых сяброў!» Не дзіва, што пад заслону дзеі неафіцыйны гімн фэсту, які Дзмітрый Цувараў з Санкт-Пецярбурга, па ўласным прызнанні, напісаў днямі літаральна за тры хвіліны пад уражаннем ад спектакляў, спявалі хорам усе прысутныя, дарослыя і дзеці. І развітваліся з усмешкамі і слязамі, каб налета сустрэцца зноў — тут, на «Нябёсах».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота аўтара.**

# СТЭРЭАРАМАН САПЕГАЎ

**У Нацыянальным гістарычным музеі на пастаяннай аснове дзейнічае ўнікальная экспазіцыя — аўтарскі праект віртуальнай рэальнасці «VKL3D». Там, надзеўшы стэрэаакуляры, можна нібыта прагуляцца па Гальшанскім і Крэўскім замках часоў іх росквіту — XV—XVII стагоддзяў. Такія адчуванні называюцца «Эфектам прысутнасці».**

У рабоце па 3D-рэканструкцыі за аснову былі ўзяты старыя выявы, архіўныя тэксты, навуковыя публікацыі, дадзеныя раскопак — усяго гэтага часта недастаткова для аднаўлення поўнай карціны з усімі дэталямі. Таму даводзілася абгрунтавана выкарыстоўваць аналагі, якіх шмат у еўрапейскай архітэктуры, натуральна, кіруючыся логікай і мастацкім густам для стварэння завершанага вобразу. Таму гэты мастацкі праект лепш вызначаць як навукова-папулярны.

**Ідэйны натхняльнік і распрацоўшчык дадзенай праграмы Ахрэм БЕЛАБРОВІК** вырашыў ажывіць замкавыя муры. І зрабіць так, каб па лесвіцах, па замкавым пляцы, па галерэях прагульваліся паны і паненкі, службовыя людзі. Такім чынам быў зроблены праект «Кунтушы маляваныя. Адзін дзень з жыцця Сапегаў». Была распрацавана сюжэтная лінія — якія падзеі маглі разгортвацца ў замку цягам аднаго дня. У ролі гістарычных персанажаў выступілі некаторыя папулярныя беларускія блогеры, медыйныя асобы, удзельнікі музычнага калектыву «Тутэйшая шляхта».

Атрыманыя фотаздымкі былі накладзены на 3D-выявы замка. Атрыманыя карціны надрукаваны ў стэрэафармаце пры падтрымцы кампаніі «Стэрэасвет». Ахрэм Белабровік расказаў карэспандэнту «Звязды» пра тое, як ствараўся гэты праект:

— Усё ішло даволі простым шляхам. Былі пытанні, чаму ў замках, панарамы якіх мы бачым, няма людзей. Тэхнічна ўставіць іх у саму панараму было даволі складана. Таму прыдумалі асобна стварыць малюнкі, а на іх дадаць персанажаў. Мы сустрэліся з ансамблем «Тутэйшая шляхта», з «Майстэрняй уражанняў», якія і сталі аднымі з галоўных удзельнікаў праекта. Спачатку меркавалася зрабіць адну, дзве ці тры выявы, аднак дзякуючы сумеснаму крэатыву выпрацаваўся сцэнарый. Малюнкі ідуць у храналагічнай паслядоўнасці і расказваюць пэўную гісторыю. Атрымаўся цэлы дзень з жыцця колішніх насельнікаў замка. Зроблены таксама і ролік з гэтымі выявамі.

Персанажамі «Аднаго дня з жыцця Сапегаў» сталі лідар гурта «Lity Taler» дудар Дэяніс Шматко, блогер Ася Паплаўская, журналіст Юлія Пранчакова, мастак-рэканструктар Ледзі Олвэн з дзецьмі, Анастасія Велесава і нават яе сабака Яхант.

— Нашу гісторыю трэба паказаць цікава, нестандартна. Толькі гэтым можна зачапіць людзей, — кажа Ахрэм Белабровік. — Мы робім гэты праект не для вузкага кола зацікаўленых асоб, а для ўсіх. У свой час я нават не думаў пра стэрэаакуляры, аднак, калі зразумеў, што можна зацікавіць людзей віртуальнай рэальнасцю, прапанаваў у такім выглядзе прадставіць нашы замкі. А ў новых карцінах выкарыстана функцыя стэрэа. Мяркую, што сама галаграфія можа зацікавіць кагосьці, а следам — і наша гісторыя.

Сцэнарый «Кунтушоў маляваных» заснаваны на рэальных падзеях гісторыі — знаёмстве і пачатку рамана маршалка слонімскага Юрыя Трызны з Рэгінай, сястрой гаспадара Гальшанскага замка Паўла Стафана Сапегі.

«На жаль, людзі не надта цікавяцца гісторыяй, — рэзюмуе Ахрэм Белабровік. — Хтосьці думае, напрыклад, што нашы замкі будавалі замежнікі. Аднак гэта ж зрабілі нашы ўласныя продкі! У суседзяў здымаюць мульцікі пра Смаленск, пра Суворава, іншыя робяць анімаваную гісторыю Польшчы... На гэтым фоне мы выглядаем не так багата. А хацелася б, каб больш было творчых людзей, гатовых рабіць нешта для Радзімы. Бо цяпер у нас вельмі мала цікавага кантэнту па гісторыі, мала малюнкаў, анімацыі і іншага. Калі я гэта зразумеў, то вырашыў, што пачну з сябе. Так і распачалася мая работа над «VKL3D».




**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**